12. Законодательные акты Франции. – СПб., 1905. – С. 28 – 30; Антология мировой политической мысли. В 5-ти т. Том 5. Политические документы. – М. : Мысль, 1997. – С. 69 –71.

13. Всеобщая Декларация прав человека. Утвержденная и провозглашенная Генеральной Ассамблеей ООН 10 декабря 1948 г. // Антология мировой политической мысли : в 5 т. – М. : Мысль, 1997. – Т. 5 : Политические документы. – С. 417.

14. См.: Преамбулу Всеобщей Декларации прав человека от 10 декабря 1948 г.

УДК 340.153 (476)

# КАТЭГОРЫЯ СВАБОДЫ Ў ТВОРАХ СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСКІХ МЫСЛІЦЕЛЯЎ

***Т.І. Доўнар,***
*прафесар БДУ, доктар юрыдычных навук, прафесар*

Пытанне аб свабодзе чалавека і ўзаемаадносінах яго з дзяржавай закраналася навукоўцамі з самых старажытных часоў. Яно было ў поле зроку і першых, вядомых нам беларускіх мысліцеляў Так, хрысціянскі дзеяч і асветніца Ефрасіння Полацкая яшчэ ў XII ст. выказвала думкі аб неабходнасці свабодных, добразычлівых адносін у грамадстве, хрысціянскага паразумення паміж людзьмі і мірнага суіснавання народаў і дзяржаў.

Перш за ўсё патрэбна звярнуць увагу на такі важнейшы фактар свабоды як выбранне жыхарамі старажытных дзяржаў свайго князя і дагавор князя з насельніцтвам, што з'яўлялася гарантам стабільнасці княжацкай улады. Увогуле характэрнай рысай тагачаснага звычаёвага права старажытных беларускіх дзяржаў была ідэя роўнасці ўсіх вольных людзей, якія валодалі аднолькавай правраздольнасцю і ўдзельнічалі ў вырашэнні дзяржаўных спраў на вечавых сходах. Знакаміты айчынны гісторык права І.А.Юхо ў сваіх публікацыях падкрэсліваў, што ў міжнародных дагаворах Полацкага, Турава-Пінскага, Віцебскага і іншых беларускіх княстваў, што дайшлі да нашага часу, утрымліваліся нормы канстытуцыйнага значэння, самыя важныя з якіх гаварылі аб незалежнасці гэтых дзяржаў і свабодзе людзей [1, с.5]. Так, у дагаворах Полацкага княства XII–XIII стст. мы знаходзім нормы аб выбранні народам полацкага князя, прычым гаварылася, што «который нелюб им – ино ему чист, иного избрати с полочан по испросу». Утрымліваліся таксама нормы аб пэўных правах і свабодах полоцкіх жыхароў, у тым ліку аб свабодзе тэрытарыяльнага перамяшчэння («Теж полочаном всим жити в Полоцку добровольно, покуль хто хочет»), імкненні палачан мірна суіснаваць з іншымі народамі. Так, часта паўтаралася: («иж бы мир тверд был», «иж бы мир не раздрушен был») [1, с.11,16].

Правы і свабоды жыхароў беларускіх княстваў захоўваліся і пасля ўваходжання гэтых зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага. Гэта бачна ў абласных граматах XV-XVI ст.ст., шэраг з якіх утрымліваў нормы аб самастойных правах жыхароў гэтых зямель: выбіраць свайго ваяводу, мець уласную маёмасць і царкву, судзіцца сваімі судамі, свабодна выязджаць за межы дзяржавы і інш. Напрыклад, у грамаце, якая была дадзена вялікім князем Віцебскай зямлі ў 1503 г.

гаварылася: “Витбляном жити у Витебску доброволно… покуль хто всхочеть, …а будет ему нелюбо: нам его силою не держати, ино ему путь чист, куды хочет, безо всякое зачепки” [1, с. 97]. Жыхары гэтых зямель захоўвалі права на ўласнае кіраванне і суды. Так, у грамаце Полацкай зямлі 1511 г. ад імя вялікага князя гаварылася: “А казнить полочаном по своему праву, а в то ся нам не вступатися» [1, с. 106]. Гэтыя законы лакальнага характара ўтрымлівалі вельмі прагрэсіўныя для свайго часу ідэі адносна палітычных і маёмасных правах жыхароў гэтых зямель.

Як сведчаць дакументальныя крыніцы, праблема правоў людзей і свабоды чалавека больш актыўна пачала абмяркоўвацца ў XV ст., а асабліва – у XVI ст. Многія айчынныя мысліцелі рабілі спробу вырашэння шэрагу важных філасофскіх і этычных праблем з пазіцый рэнесанснага гуманізму і перш за ўсё – праблемы чалавека і грамадства. Як адзначае С. Падокшын, прыярытэт у пастаноўцы і гуманістычнай трактоўцы разнастайных аспектаў гэтай праблемы (духоўнага свету, прызначэння, годнасці, сэнсу жыцця, каштоўнасцей і ідэалаў, суадносін індывідуальнага і агульнага дабра, грамадскай актыўнасці, духоўна-маральнай свабоды,паходжання маральных уяўленняў, узаемасувязі духоўнага ўдасканалення чалавека з удасканаленнем грамадскіх інстытутаў і г. д.) належыць Францыску Скарыне [2, с. 138]. Патрэбна адзначыць, што многія замежныя філосафы і багасловы (Святы Аўгусцін, Фама Аквінскі і інш.) не ўяўлялі рэалізацыі пазітыўнага, дабрачыннага аспекту свабоды без царкоўнага пасрэдніцтва. Гуманісты ж рашуча выступілі супраць артадаксальна-хрысціянскай трактоўкі чалавечай свабоды. Таксама ў Вялікім Княстве Літоўскім разам з актывізацыяй рэфармацыйна-гуманістычнага руху адной з найбольш істотных ідэй, якая пачала абмяркоўвацца ў другой палове XVI ст., стала ідэя духоўна-маральнай свабоды чалавека. Пры гэтым для айчынных мысліцеляў характэрным стала імкненне змякчыць канцэпцыю абсалютнага наканавання, якая паводле Аўгусціна была цалкам сумяшчальная з чалавечай свабодай, і зблізіць яе з гуманістычным вучэннем аб маральнай свабодзе чалавека і яго індывідуальнай адказнасцю за свае паводзіны (С. Будны, Я. Даманеўскі і інш.). Асобныя ж мысліцелі абгрунтоўвалі канцэпцыю абсалютнай маральнай свабоды чалавека (Л.Зізаній і інш.). Увогуле мысліцелі Беларусі імкнуліся да ўзгаднення прынцыпу свабоды з прынцыпам агульнага дабра, падкрэсліваючы прыярытэт грамадскіх інтарэсаў перад асабістымі [2, с. 148].

У працах многіх беларускіх асветнікаў, мысліцеляў і палітычных дзеячоў XVI ст. прысутнічаюць самыя прагрэсіўныя ідэі свайго часу. Асобнае месца ў іх займае тэарэтычная рапрацоўка ідэй аб справядлівай дзяржаве, свабодзе і роўнасці людзей. У сувязі з гэтым ў сваіх выказваннях і публікацыях яны пачынаюць крытыкаваць існуючыя феадальныя адносіны і тэарэтычна абгрунтоўваць неабходнасць іх рэфармавання. Значная ўвага надавалася мысліцелямі праблеме належнага функцыянавання дзяржавы і грамадства. Так, Мікола Гусоўскі ў “Песні пра зубра” паказаў свае адносіны да ідэі свабоды людзей і незалежнасці дзяржавы. Сама дзяржава нікому не павінна падпарадкоўвацца, а яе жыхары павінны ўмець абараняць свабоду і незалежнасць. Паэт падкрэсліваў неабходнасць мірнага суіснавання народаў, верацярпімасці, устанаўлення справядлівай дзяржаўнай улады, пры якой людзі дабраахвотна прытрымліваюцца законаў [3].

Асабліва значнае месца ў навуковых працах беларускіх мысліцеляў-гуманістаў (Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, М. Літвіна, А. Волана, С. Буднага і інш.) займалі ідэі аб справядлівасці грамадскіх адносін і правах людзей. Яны аргументавана даказвалі неабходнасць ўдасканалення дзяржаўных і грамадскіх адносін на падставе новых, больш прагрэсіўных і высокамаральных прынцыпаў. Так, вышэйшым прынцыпам у рэгуляванні грамадскіх адносін Скарына лічыў любоў чалавека да чалавека. Закранаючы пытанне аб свабодзе асобы ў грамадскіх адносінах, ён звяртаў увагу на прытрымліванне кожным чалавекам этыкі "хрысціянскага гуманізму" і маральную адказнасць хрысціяніна за свае справы. Увогуле асновай палітыка-прававых поглядаў Скарыны выступала гуманістычна інтэрпрэтуемая хрысціянская мараль, адносна якой свабода з'яўляецца важнейшай уласцівасцю чалавечай прыроды [4, с.100-101, 136-142]. Аналізуючы і высока ацэньваючы творчую спадчыну Скарыны, С.Падокшын падкрэслівае, што ўжо ў яго Прадмовах у пачатковым выглядзе прысутнічае ідэя прававога грамадства і дзяржавы [2, с.148].

На падставе скарынінскіх тэарэтыка-прававых напрацовак іншыя беларускія філосафы і мысліцелі пачынаюць ўсё актыўней выказваць і абгрунтоўваць думкі аб справядлівасці дзяржаўнай улады, вяршынстве закону, неабходнасці такой прававой рэгламантацыі дзяржаўнага жыцця, якая б забяспечвала індывідуальную свабоду і сцвярджала роўнасць усіх перад законам. Паступова на працягу XVI ст. увага мысліцелей не толькі ўсё больш засяроджваецца на ідэях свабоды як важнейшай уласцівасці чалавечай прыроды і роўнасці ўсіх людзей перад законам як істотнага элемента свабоды, але з'яўляюцца і практычныя прапановы аб заканадаўчым іх афармленні. Пры гэтым некаторыя з іх падкрэсліваюць, што закон толькі тады здольны гарантаваць свабоду асобы, калі ён будзе накіраваны на абарону інтарэсаў ўсіх людзей – грамадзян дзяржавы. Так, Леў Сапега, дэвізам жыцця яго быў прынцып, сфармуляваны яшчэ рымскімі юрыстамі – "Блага грамадства, найвышэйшы закон", пад уплывам поглядаў мысліцеляў антычнасці надае значную ўвагу ўдасканаленню грамадскіх адносін і правам грамадзян у дзяржаве. Пры гэтым ён асабліва падкрэслівае, што "чоловеку почтивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность" [5, с.47]. Сутнасць жа свабоды, на яго думку, складаюць неад'емныя правы чалавека – асабістая недатыкальнасць і права ўласнасці. Сапега адзначае, што асноўнай мэтай законаў ва ўсім свеце з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога парадку, каб кожны чалавек мог захаваць у непарушнасці сваё добрае імя, здароўе, маёмасць і не цярпець ніякай шкоды з боку іншых асоб.

Следам за Скарынай Міхалон Літвін у сваім палітычным трактаце «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» (1550 г.) абгрунтоўвае неабходнасць удасканалення і демакратызацыі грамадскіх адносін, у тым ліку ўстанаўлення роўнасці усіх саслоўяў перад законам. У сувязі з гэтым ён абураецца становішчам, калі ўвесь цяжар падаткаў па ўтрыманню дзяржаўнага апарату ўскладаецца на плечы сялян і гараджан і прапаноўвае – хто мае больш зямлі, той і плаціць павінен больш.

На хвалі рэфармацыйнага руху, які значна паўплываў на усе бакі грамадска-палітычнага жыцця, пашыраліся і прапагандаваліся самыя прагрэсіўныя на

той час сацыяльна-этычныя і палітыка-прававыя ідэі. Прыхільнікамі і актыўнымі прапагадыстамі Рэфармацыі былі многія мысліцелі і дзяржаўныя дзеячы (А.Волан, А.Валовіч, П.Астравіцкі, К.Радзівіл і інш.). У аснову яе перш за ўсё была пакладзена ідэя боскай справядлівасці і звяртання да чалавечага розуму. У ходзе Рэфармацыі актыўна развівалася асветніцтва, што садзейнічала пашырэнню ідэй гуманізму, свабоды, верацярпімасці і інш. У гэты перыяд у рэнесансна-гуманістычных колах сфарміравалася і канцэпцыя рэлігійнай свабоды, якая адыграла істотную ролю ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці. Вельмі плённай аказалася ідэя агульначалавечых духоўна-культурных каштоўнасцей, незалежнасці іх ад веравызнання, рэлігіі. Мысліцелі стараліся зрабіць крытэрыям існіннасці маральных паняццяў іх усеагульнасць, міжчалавечую і міжканфесіяльную універсальнасць [2, с.253]. Ідэя Скарыны, С.Буднага, Л.Зізанія і іншых аб магчымасці дасягнення маральнага ідэалу індывідуальнымі намаганнямі, без царкоўнага пасрэдніцтва з’яўлялася па сутнасці, як адзначае С.Падокшын, “праяўленнем у сферы этыкі аднаго з вядучых прынцыпаў рэнесансна-гуманістычнага светапогляду – свабоды” [2, с.205].

На падставе скарынінскіх напрацовак беларускія мысліцелі пачынаюць ўсё актыўней абмяркоўваць пытанні, звязаныя з правамі і свабодамі людзей, узаемаадносін іх з дзяржаўнай уладай, выказваць думкі адносна справядлівасці і законнасці дзяржаўнай улады, неабходнасці вяршынства закону і такой прававой рэгламантацыі дзяржаўнага жыцця, якая б забяспечвала індывідуальную свабоду і сцвярджала роўнасць усіх перад законам. Паступовa на працягу XVI ст. увага мысліцелей не толькі ўсё больш засяроджваецца на ідэях свабоды як важнейшай уласцівасці чалавечай прыроды і роўнасці ўсіх людзей перад законам як істотнага элемента свабоды, але з’яўляюцца і прапановы аб заканадаўчым іх афармленні. Пры гэтым некаторыя з іх падкрэсліваюць, што закон толькі тады здольны гарантаваць свабоду асобы, калі ён будзе накіраваны на абарону інтарэсаў ўсіх людзей – грамадзян дзяржавы.

У гэты перыяд А.Волан і С.Будны высоўваюць і абгрунтоўваюць ідэю прыватнай уласнасці для усіх людзей (нават гараджан і сялян) як неабходнай умовы свабоды асобы. Менавіта філосаф, правазнаўца і палітычны дзеяч Андрэй Волан, які з’яўляўся адным з ідэолагаў рэфармацыйнага руху ў Беларусі, унес шмат новага ў тэарэтычную распрацоўку катэгорыі свабоды. У сваіх шматлікіх навуковых працах палеміка-тэалагічнага, этычнага і палітыка-прававога характару (“Пра палітычную або грамадзянскую свабоду”, Кракаў, 1572; “Прамова да сената…” (Кракаў, 1572); “Пра шчаслівае жыццё або Найвышэйшае чалавечае дабро”, Вільня, 1596; ”Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці”, Гданьск, 1608 і інш.) ён перш за ўсё выказвае погляды на такія інстытуты як дзяржава і права, рэзка крытыкуе існуючую феадальную сістэму і прапаноўвае шляхі яе рэфармавання ў сацыяльным і палітычным плане [6, с.76-77]. Несумненная заслуга А.Волана ў тым, што ён адмаўляў рабства і актыўна выступаў супраць заканадаўчай рэгламентацыі саслоўнай няроўнасці людзей. Бадай, ён быў адным з першых навукоўцаў, які разглядаў саслоўі як раўнапраўных сацыяльных партнёраў, кожная з якіх уносіць пасільны ўклад у агульную справу эканамічнага і палітычнага развіцця дзяржавы.

Дзяржаву, права і іншыя сацыяльна-палітычныя інстытуты А.Волан разглядае як вынік чалавечай дзейнасці, як аб'екты ўвасаблення рацыянальных пошукаў і мудрасці людзей [7, с. 64]. Ён адзываецца аб ёй як аб згуртаванні людзей, супольніцтве, таварыстве, падкрэсліваючы тым самым дагаворны характар дзяржавы.. Аднак выкарыстанне гэтых паняццяў у яго не звязана, як у Бадэна, Гоббса і іншых еўрапейскіх мысліцеляў, з праблемамі ўлады і суверэнітэту. Перш за ўсё ён разглядаў дзяржаву і грамадства як гістарычна абумоўленыя з'явы і адзначаў, што "ў чалавечай супольнасці, называемай грамадствам, найважнейшая чыннасць заключаецца ў тым, каб разумна і правільна кіраваць гэтым грамадствам у мірных умовах і нязломна, мужна, рашуча змагацца з ворагам у час вайны" [7, с.5]. Ён падкрэслівае, што сама дзяржава стваралася з той мэтай, каб людзі маглі шчасліва і блаславенна праводзіць сваё жыццё. Пры гэтым Волан звяртае ўвагу на неабходнасць устанаўлення справядлівых грамадскіх адносін і выказвае думку, што справядлівай з'яўляецца тая дзяржава, у якой чалавек шчаслівы, задаволены жыццём і абаронены законам ад усялякіх пасягальніцтваў. Увогуле справядлівасць, на яго думку, заключаецца ў тым, каб "пашанаваць і паважаць Бога, любіць бацькоў і айчыну, у абыходжанні з людзьмі ніколі нікога не крыўдзіць і не прыніжаць не толькі ўчынкам, але і словам" [7, с. 95]. Пры гэтым адзначае, што справядлівасць у чалавечым грамадстве можа існаваць толькі пры умове, што ў ім існуюць законы, створаныя на карысць грамадзян, і што ўладатрымальнікі накіроўваюць гэтыя законы на паспалітае дабро.

На падставе ідэй Ф.Скарыны Андрэй Волан распрацаваў уласную канцэпцыю свабоды чалавека. Ён падкрэслівае, што прырода надзяліла чалавека найвялікшымі каштоўнасцямі, сярод якіх "найбольшай каштоўнасцю, бадай, ёсць свабода" і адзначае, што "…для дзяржавы няма нічога важнейшага і нічога карыснейшага за свабоду", якая нікому не чыніць зла і падтрымлівае панаванне справядлівых законаў, бо ва ўмовах беззаконнасці "чалавечае жыццё з'яўляецца жабрацкім і рабскім", а чалавечае грамадства не можа быць даўгавечным і трывалым [7, с.12]. Менавіта таму дзяржава, як страж супольнай свабоды, дзеля захавання гэтай свабоды ўстанаўлівае законы, скіраваныя супраць парушэння законаў і супраць злачынства. Адначасова А.Волан перакананы, што законы, устаноўленыя насуперак правільнаму суджэнню розуму, недаўгавечныя, бо яны пастаянна будуць выклікаць усеагульную незадаволенасць грамадзян і могуць прывесці да народнага паўстання.

З неабходнасці ўсямернай абароны свабоды чалавека Волан выводзіў натуральную функцыю права, якая заключаецца ў падаўленні ганебных інстынктаў людзей і справядлівым рэгуляванні грамадаскіх адносін. У цэлым права, якое, на яго думку, створана розумам чалавека, павінна стаяць на абароне агульнай справядлівасці і павінна адпавядаць тром прынцыпам – быць справядлівым, выступаць гарантам свабоды і роўнасці, быць разумным. З апошняга тэзіса выцякала неабходнасць пастаяннага ўдасканалення заканадаўства. Волан падкрэсліваў, што ніякае грамадства, ніякая грамадзянская супольнасць, ніякі мір і спакой паміж людзьмі не могуць існаваць без законаў і ўвогуле "дабрадзейства свабоды залежыць ад правільнага і ўпарадкаванага заканадаўства" [7, с. 96].

Грунтуючыся на гістарычным, навуковым і практычным вопыце, Волан адзначаў, што ніякія добрыя і гуманныя намеры правіцеля не могуць засцерагчы чалавека ад самавольства як самога правіцеля, так і яго дзяржаўна-адміністрацыйнага і судовага апарату і даказваў, што ўсялякая ўлада непазбежна вырадзіцца ў тыранію, калі не будзе існаваць дасканалага заканадаўства, якое будзе рэгламентаваць і абмяжоўваць яе дзейнасць. З гэтага выцякае, што свабода пераважна разумелася ім як свабода прававая, як забеспячэнне законам ўсеагульнай згоды і міру ў дзяржаве, абароны асабістай бяспекі чалавека і яго маёмасці. Першай жа умовай свабоды ён лічыў бяспеку чалавека і падкрэсліваў, што ў грамадскім жыцці "чалавеку не павінны пагражаць самавольства, гвалт і забойства, а яго скарбу і майну – грабеж і разарэнне" [7, с. 57]. З гэтых палажэнняў ён рабіў вывад, што гарантаваная законам абарона асабістых і маёмасных правоў чалавека з'яўляецца падставай жыццяздольнасці самой дзяржавы і толькі ў той дзяржаве, дзе жыццё людзей аберагаецца і ахоўваецца ад насілля і ўсялякай несправядлівасці, а маёмасць ад грабяжу, грамадская супольнасць аказваеца "цэльнай і здаровай, а слаўнае і прыгожае імя "свабода" застаецца непарушнай і трывалай" [7, с. 57].

Волан падтрымлівае ідэю Арыстоцеля "Мы рабы законаў, каб быць свабоднымі" і акцэнтуе ўвагу на тым, што свабода не азначае ўседазволенасці, бо перш за ўсё "мае на мэце высакародныя ўчынкі і заўсёды спалучаеццца са станоўчым ладам мыслення" [7, с. 18]. На яго погляд, свабода кожнага будзе забяспечана дастаткова, калі законы ў грамадстве прымусяць людзей жыць так, каб ніхто нікому не шкодзіў. Ён падкрэсліваў, што менавіта законы прызначаны служыць апорай свабоды і яны "забяспечваюць цэласць і непарушнасць грамадзянскай свабоды і ствараюць умовы для агульнага дабрабыту, пры якім кожны адчувае сябе абароненым ад ліхадзейства" [7, с. 87]. 21. Такім чынам ён надае важную ролю закону і неаднойчы падкрэслівае, што "закон ёсць падмурак свабоды", ён ёсць тое маральнае правіла, якое дыктуецца здаровым розумам і ўхваляецца Боскімі запаветамі. Пры гэтым звяртае ўвагу, што ніякая прававая норма, якая па прыродзе сваёй не абапіраецца на дабро і справядлівасць, не можа мець у чалавечым грамадстве сілу закона [7, с. 21, 27, 47].

Надаючы значную ўвагу абароне правоў чалавека, у тым ліку і абароне права прыватнай уласнасці, Волан адначасова акцэнтуе ўвагу на тым, што існаванне ў грамадстве залішняй чалавечай раскошы можа запляміць прыгожае імя свабоды. Менавіта таму "дзяржава павінна ствараць законы, якія перакрыюць усе крыніцы сілкавання злашчаснай раскошы і ўрэшце ліквідуюць яе [7, с. 86].

Выказваючы думку аб неабходнасці рэфармавання існуючых грамадскіх адносін, мысліцель адначасова ганарыцца сваёй дзяржавай і існуючымі у ёй парадкамі. Так, параўноўваючы грамадска-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай, у якой, на яго думку, "адсутнічае свабода і тыран правіць па сваёй прыхамасці, а законам лічыць усё тое, што захочуць яго распаленыя мазгі", ён піша: "Наш народ забяспечыў сабе мір і агульную свабоду болей удумліва. Ён абмежаваў караля рамкамі законаў, каб ён не насмеліўся замысліць нешта супроць грамадзян ці мог паквапіцца на іхнюю маёмасць". З го-

нарам за сваю айчыну Волан адзначае, што “шляхта ў нашым грамадстве мае намнога большую свабоду, чым нобілі іншых народаў” [7, с.46-47].

Такім чынам у творах Волана, а таксама многіх іншых прагрэсіўных беларускіх мысліцеляў XVI ст. усё актыўней абгрунтоўваецца ідэя, што закон толькі тады можа гарантаваць свабоду, калі ён накіраваны на абарону ўсіх людзей – жыхароў дзяржавы. Усё большае пашырэнне атрымлівае ідэя роўнасці перад законам як істотнага элемента свабоды асобы, а таксама ідэя свабоды як важнейшай уласцівасці чалавечай прыроды. Фактычна, у яго творах прысутнічае ідэя прававой дзяржавы, якая знайшла адлюстраванне ў такіх яго тэзісах і палажэннях, як неабходнасць заканадаўчага і рэальнага забеспячэння свабоды чалавека; абмежавання ўлады; наяўнасць у дзяржаве вяршэнства і аўтарытэта закона і падпарадкаванасць яму ўсіх без выключэння людзей, адміністрацыйных асоб і самога манарха; устанаўленне справядлівай і незалежнай судовай улады, выхаванне кампетэнтных, кваліфікаваных і высокамаральных службоўцаў, у тым ліку юрыстаў і інш.

У сувязі з гэтымі тэарэтычнымі напрацоўкамі беларускіх мысліцеляў сам закон XVI ст., нягледзячы на існаванне феадальных адносінаў, вымушан быў замацаваць ідэю свабоды чалавека. Так, у Статуце 1529 года ад імя вялікага князя гаварылася: "Шлюбуем своею парсунаю господарскою, иж всю шляхту княжата и паны хоруговные, и вси бояре посполитые, и мещане, и их людей заховати при слободах и вольностях, от предков наших и тэж от нас даных им" [8, с. 49, р. 3, арт. 7]. У 1564 г. на Бельскім сойме 1564 года шляхта дамаглася прыняцця прывілея, ў якім гаварылася, што ўсе жыхары дзяржавы, пачынаючы з вялікага князя і да ніжэйшых саслоўяў, як духоўных так і свецкіх, павінны ўжываць адно роўнае права і ўсе яны заслугоўваюць быць годнымі ўсялякіх вольнасцяў і справядлівасці, якія стануць падставай умацавання дзяржавы [9, с. 40-47]. У 1565 г. на сойме ў Вільні быў прыняты яшчэ адзін прывілей, у якім вялікі князь прама пазначыў, што гэты закон выдаецца па просьбах і чалабітных «усіх станаў… для способу лепшого и отправы поспешнейшое в справедливости людской» [9, с. 47–48]. Нягледзячы на тое, што ў рэчаіснасці ўсе гэтыя правы тычыліся ў асноўным саслоўя шляхты, пазней Статуты 1566 і 1588 гг. таксама заканадаўча абавязвалі ўладу “всих людей … заховати при свободах и вольностях” (5, 9, р. III, арт. 2).

На працягу XVII–XVIII стст. іншыя айчынныя мысліцелі (А. Каяловіч, І. Мялешка, М. Сматрыцкі, А. Філіповіч, К. Нарбут, М. Сарбеўскі і інш.) ўсё актыўней пачынаюць выказваць думку аб ураўненні ў правах прадстаўнікоў усіх саслоўяў, аб правах і свабодах усіх людзей. Так, С.Полацкі, у цэнтры ўвагі якога заўсёды знаходзіўся чалавек, у творы “Вертаград мнагацветны” (1668 г.) гаварыў аб справядлівасці грамадскіх адносін, роўнасці ўсіх людзей перад законам і судом, прапагандаваў свой ідэал гарманічна развітай і карыснай грамадству асобы і з мэтай яго ажыццяўлення прапаноўваў асабістым прыкладам і высакароднымі учынкамі выхоўваць высокія маральныя якасці – дабрачыннасць, справядлівасць, любоў да працы і інш, а таксама заклікаў да сумленнага і справядлівага выканання грамадзянскіх абавязкаў [10, с. 157]. А.Алізароўскі у творы “Аб палітычнай супольнасці людзей” (1651 г.) палемізуе з тымі аўтарамі, якія сцвярджалі, што толькі прадстаўнікі шляхты павінны карыстацца

грамадзянскім правамі і свабодамі і даказвае неабходнасць пашырэння іх на ўсіх жыхароў дзяржавы [11, с. 7-8].

У заключэнне патрэбна сказаць, што праблема свабоды чалавека працягвала абмяркоўвацца і ў далейшым, аднак уся наступная прагрэсіўная нацыянальна-арыентаваная думка Беларусі фактычна пайшла па шляху, вызначаную адзначанымі папярэднімі знакамітымі айчыннымі мысліцелямі.

***Спіс выкарыстанай літаратуры:***

1. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: Дапаможнік / Я. Юхо, А. Абрамовіч, Т. Доўнар, У. Сатолін. – Мінск : БДУ, 2000. – 127 с..

2. Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі : Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / пад рэд. А.С. Майхровіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 285 с.

3. Гусоўскі М. Песня пра зубра. Паэма / Прадмова В. Дарашкевіча, Я. Семяжона. Пер. з лац. на бел., камент. Я.Сямежона; пер. з лац. на рус. Я. Сямежона і Я. Парэцкага.– Мінск : “Мастацкая літаратура”. 1981. – 144 с.

4. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед.– Мінск : БелСЭ. 1988.–376 с.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

6. Доўнар Т. І. Андрэй Волан (Валян) – беларускі філосаф і правазнаўца XVI стагоддзя // Юстыцыя Беларусі. 2012, № 8. – С.75-77.

7. Волян А. Аб грамадзянскай або палітычнай свабодзе / А. Волян; пер. з лац. Ул. Шатона. – Мінск : Зміцер Колас, 2009. – 142 с.

8. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года. – Минск: Издательство Академии наук БССР, 1960. – 254 с

9. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.

10. Шалькевіч В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : Навучальны дапаможнік / Серыя : Гісторыя бацькаўшчыны” дадатак да часопіса “Права і эканоміка”. – Мінск, 2-е выд., 1999. – 200 с.

11. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI–XVIII ст. : Хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мінск : БДУ, 2004.- 206 с.

УДК 341.9:341.211/.214

## ИММУНИТЕТ ГОСУДАРСТВА В КОНТЕКСТЕ РАЗВИТИЯ ИНСТИТУТА ПРАВ ЧЕЛОВЕКА

***О.А. Евменчикова,***
*аспирант Белорусского государственного университета*

В настоящее время в юридической доктрине и национальном законодательстве ряда зарубежных государств существует три подхода к вопросу иммунитета государства: теория абсолютного иммунитета, теория функционального иммунитета и теория ограниченного иммунитета. Указанные теории по-разному